Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 13 (404) | Субота, 9 красавіка 1960 года. | Цана 10 кап.

# IX КУРСАВАЯ РАБОТА

★ Рэпартаж ★

### БЯДА ПРЫШЛА НЕЧАКАНА...

Аднойчы ў дэканаце хімічнага факультэта трывожнай трэллю заліўся тэлефон. Званілі з завода медпрэпаратаў.

— Просім вашай дапамогі,— пачуўся ў трубцы ўсхваляваны голас.—Магчыма вы ведаеце, у рэспубліцы арганізавана прамысловая вытворчасць антыбіётыкаў. Наш завод пачаў выпускаць біяміцын. Аднак цяпер мы вымушаны спыніць вытворчасць. Квартальны план пад пагрозай зрыву...

Гэта гаварыў дырэктар завода Мікалай Рыгоравіч Сяміжон. Хваляванне яго было зразумелым Біяміцын — адзін з эфектыўнейшых антыбіётыкаў, які стымулюе рост жывёл. Аднак на заводзе скончыліся запасы аднаго з кампанентаў, што быў неабходны для яго вытворчасці. Справа ўскладнялася і тым, што бензілраданід выпускала ў вельмі абмежаванай колькасці адна з лабараторый у Маскве. Гэта на увесь СССР! Выехаўшыя ў Маскву пасланцы завода вярнуліся ні з чым. Вось тады і прышла думка звярнуцца за дапамогай да хімікаў нашага універсітэта.

### ПОШУКІ

Іван Рыгоравіч Цішчанка, дэкан хімічнага факультэта не адразу даў станоўчы адказ. Сам спецыяліст у галіне сінтэзу, ён разумеў, што вытворчасць раданістага бензілу будзе прадстаўляць пэўныя цяжкасці.

Давялося засесці за літаратуру. Нямала перагартаў кніг Іван Рыгоравіч, але дарэмна. Толькі і высветліў, што патэнтаваная методыка вытворчасці раданістага бензілу ёсць у спецыялізаваных замежных часопісах па хіміі. Аднак знайсці гэтыя выданні ў Мінску аказалася немагчымым. «Але ж хіба,— падумаў Іван Рыгоравіч,— нельга адшукаць блізкую методыку вытворчасці рэчываў, падобных па сваіму хімічнаму складу да раданістага бензілу»?

І зноў пошукі. Іван Рыгоравіч вывучае тэхналогію вытворчасці шэрагу хімічных рэчываў. І вось, здаецца, нешта падобнае знойдзена.

Вучоны засеў за разлікі. Трэба было напісаць рэакцыі, разлічыць у якіх суадносінах неабходна браць для атрымання раданістага бензілу зыходныя рэчывы.

Нарэшце, на заводзе медпрэпаратаў пачуўся такі чаканы там званок. Так, універсітэт бярэцца арганізаваць вытворчасць бензілраданіду, але на факультэце няма аднаго з патрэбных кампанентаў — хлорыстага бензілу.

Праз дзесяць мінут у кабінет да Івана Рыгоравіча зайшоў начальнік аднаго з цэхаў завода т. Рабцаў — ён прывёз з сабой патрэбную колькасць гэтага рэчыва.

### НЕ ТОЛЬКІ ДЛЯ ЗАЛІКУ

Юры Лосеў і Валеры Маляўка крыху здзівіліся, калі ім у якасці курсавой работы прапанавалі ў дэканаце наладзіць вытворчасць нейкага раданістага бензілу.

— Толькі ўлічыце,— сказаў хлопцам Іван Рыгоравіч,— гэта рэчыва вельмі патрэбна заводу медпрэпаратаў. Так што трэба зрабіць хутка, а папрацаваць давядзецца нямала.

Студэнты з энтузіязмам узяліся за справу. І гэты энтузіязм асабліва падагравала тое, што яны адразу ж адчулі, як патрэбна іх крыху незвычайная курсавая работа працаўнікам вытворчасці. У першы ж дзень у іх пабываў інжынер завода т. Рабцаў, пацікавіўся, як ідуць справы. Не, не толькі для заліку працавалі яны!

...Па кроплях сцякае ў раствор раданістага калія хлорысты бензіл. Хлопцы з хваляваннем нахіліліся над колбай. Калі вадкасць атрымаецца бязколерная, значыць усё ў парадку. Але... вадкасць паступова цямнее і робіцца зусім бурай.

— Ну вось, першы блін комам,— са злосцю кінуў Маляўка.

— Трэба будзе больш дакладна і пільна захоўваць тэхналогію,— прамовіў Лосеў.

Першая няўдача быццам падштурхнула хлопцаў. Яшчэ з большым азартам яны ўзяліся за эксперыменты, праводзілі ў лабараторыі вечары, працавалі нават у нядзелю.

...Гэта і было ў нядзелю. Асцярожна зняў Маляўка са штатыва колбу, на дне якой віднеліся белыя крышталы. Яны мелі страшна непрыемны пах. аказаліся едкімі і абпальвалі скуру. Хлопцы даведаліся аб гэтым хутка—нясцерпна пачало пячы рукі, якімі яны бралі крышталы. Але сябры былі шчаслівымі. Яны ведалі: завод можа аднавіць вытворчасць біяміціну.

### ШТО ГЭТА ДАЕ

У заключэнне нашага рэпартажа прывядзем вытрымку з адносіны ва універсітэт Інстытута жывёлагадоўлі з просьбай дапамагчы заводу медпрэпаратаў наладзіць вытворчасць гэтага антыбіётыка «У 1960 годзе,— гаварылася там,— мінскі завод медпрэпаратаў можа вырабіць каля 2 000 мільярдаў адзінак кармавога біяміцыну, выкарыстанне якога дазволіць **атрымаць рэспубліцы дадаткова прыкладна 40 000 цэнтнераў свінога мяса».**

А. ГАРЭЗНЫ.

ЯНЫ ВЫХОДЗЯЦЬ У ЖЫЦЦЁ



**Нічым асаблівым не адрозніваецца ад сваіх таварышоў па курсу выпускнік хімфака Уладзімір Верашчагін. Таксама, як і яны, ён з захапленнем працуе над дыпломнай работай. Толькі бадай што ў яго яна некалькі складаней.**

**Ёсць ва Уладзіміра моцнае жаданне—ён хоча паехаць у Сібір, на якую-небудзь хімічную будоўлю сямігодкі. Добрая мара! Няхай жа яна ажыццявіцца.**

**НА ЗДЫМКУ: Уладзімір Верашчагін у лабараторыі.**

**Фота У. БАБКОВА.**

*Да 90-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна*

# ЛЕНІН І ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА

*Работы У. І. Леніна адкрываюць новы этап у гістарычнай навуцы. У ленінскіх працах, у яго выказваннях па асобных праблемах гісторыі выступае вялікі геній гістарычнай навукі, які глыбока вывучыў увесь гістарычны працэс развіцця чалавецтва ў цэлым. У. І. Ленін паказаў, што толькі марксізм даў упершыню адзінае правільнае разуменне гісторыі.*

*На кожным павароце грамадскага жыцця У. І. Ленін для больш глыбокага разумення сучаснасці звяртаўся да ўрокаў гісторыі. Ён вывучаў велізарны фактычны матэрыял і па-новаму, па-марксісцку яго растлумачваў. Сіла ленінскага вучэння заключаецца ў тым, што яго ацэнка сучаснасці і прадбачанне будучага базіраваліся на навуковым аналізе гістарычнага мінулага і глыбокім раскрыцці сучаснага.*

*Для ленінскіх твораў характэрны партыйны, класавы падыход пры вывучэнні любых пытанняў гістарычнай навукі. У. І. Ленін даў класічныя ўзоры прымянення прынцыпа партыйнасці пры аналізе гістарычнага працэса.*

*У працах У. І. Леніна знайшлі сваё вырашэнне вузлавыя пытанні гісторыі Расіі. У іх сфармуляваны і паслядоўна развіты асноўныя палажэнні марксісцкай канцэпцыі гісторыі нашай краіны. У. І. Ленін даў поўную закончаную канцэпцыю рускага гістарычнага працэса са старажытных часоў да нашых дзён. Ён дакладна ўстанавіў перыядызацыю, паказаў, непарыўную сувязь гісторыі СССР з сусветнай гісторыяй чалавецтва.*

*У шматлікіх даследаваннях У. І. Ленін асвятліў асноўныя пытанні гісторыі рускага феадалізма, гісторыі развіцця капіталізма ў Расіі, гісторыі дзяржаўнага ладу, гісторыі рэвалюцыйнага і грамадскага руху.*

*Асабліва вялікія заслугі У. І. Леніна ў распрацоўцы тэарэтычных і канкрэтных пытанняў гісторыі Расіі перыяда імперыялізма. Ленін ускрыў агульныя рысы імперыялізма як капіталізма на той стадыі развіцця, калі склалася панаванне манаполій і фінансавага капітала, набыў выключнае значэнне вываз капітала, пачаўся падзел свету міжнароднымі трэстамі і закончыўся падзел усёй тэрыторыі зямлі буйнейшымі капіталістычнымі краінамі.*

*Ленін характарызуе імперыялізм як «паміраючы капіталізм», які абвастрае супярэчнасці і падводзіць да неабходнасці пралетарскай рэвалюцыі.*

*Ускрываючы агульныя рысы, У. І. Ленін разам з тым паказаў канкрэтныя праявы і асаблівасці імперыялізма ў розных краінах. Вялікую ўвагу ён удзяліў характарыстыцы імперыялізма ў Расіі, які ён вызначыў як ваенна-феадальны імперыялізм, гэта значыць, імперыялізм, які аплецены густой сеткай дакапіталістычных адносін.*

*На строга навуковай базе вырасла ленінская тэорыя аб буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў перыяд імперыялізма. У працах У. І. Леніна дадзены глыбокі аналіз характара буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, яе рухаючых сіл, распрацаваны пытанні аб рэвалюцыйным саюзе пралетарыята і сялянства і аб перарастанні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную.*

*Велізарным адкрыццём У. І. Леніна з'явіўся закон аб няроўнамернасці і скачкападобнасці развіцця капіталізма. На аснове гэтага адкрыцця Ленін прышоў да вываду аб магчымасці перамогі сацыялізма ў адной краіне. Ён паказаў, што іменна Расія бліжэй іншых краін падыйшла да сацыялістычнай рэвалюцыі.*

*Ленінская тэорыя сацыялістычнай рэвалюцыі развязвала ініцыятыву пралетарыята асобных краін, адкрывала шырокія перспектывы паспяховай барацьбы рабочых за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі.*

*Вялікую цікавасць для гісторыкаў мае ленінскі аналіз унутранай і міжнароднай абстаноўкі ў перыяд падрыхтоўкі Кастрычніка. У ленінскіх творах раскрыта расстаноўка класавых сіл у краіне пасля Лютаўскай рэвалюцыі, паказана контррэвалюцыйнасць рускай буржуазіі, раскрыта яе змова з замежнымі імперыялістамі. Ленін паказаў, што дробнабуржуазныя партыі эсэраў і меншавікоў з'яўляліся злоснымі ворагамі сацыялістычнай рэвалюцыі. У працах Уладзіміра Ільіча паказана значэнне саюза рабочага класа і бяднейшага сялянства ў барацьбе за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі.*

*Пасля перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі У. І. Ленін удзяліў вялікую ўвагу распрацоўцы праграмы Савецкай рэспублікі. Ён лічыў неабходным весці індустрыялізацыю краіны на аснове пераважнага развіцця цяжкай індустрыі, змагацца за калектывізацыю сельскай гаспадаркі, культурную рэвалюцыю, сістэматычны ўздым матэрыяльнага дабрабыту працоўных, умацаванне савецкай дзяржавы.*

*У. І. Ленін на аснове глыбокага вывучэння эканомікі краіны і яе прыродных рэсурсаў, дапытлівага вывучэння суадносін класавых сіл прыйшоў да вываду аб магчымасці пабудовы поўнага сацыялістычнага грамадства ў Савецкім Саюзе.*

*У. І. Ленін унёс шмат новага пры вывучэнні гісторыі СССР на ўсіх яе этапах.*

*У творах У. І. Леніна мы знаходзім таксама каштоўныя думкі аб гісторыі антычных дзяржаў, аб дзяржавах сярэдневяковых і новых еўрапейскіх і азіяцкіх, аб гісторыі Кітая.*

*У кароткім артыкуле няма магчымасці паказаць поўнасцю багацце ленінскіх думак у галіне гістарычнай навукі. Уладзіміру Ільічу, нашаму правадыру і настаўніку, савецкая гістарычная навука абавязана ўсімі сваімі дасягненнямі*

**М. ФРЫДМАН,**
**дацэнт, кандыдат гістарычных навук.**

# Мы будзем чакаць вас, сябры!

Цягнік «Брэст—Масква» ўжо амаль спыніўся. Мы ў натоўпе людзей прасоўваліся да вагонаў. Таварышы дaручылі нам убачыць і вітаць ад імя студэнтаў універсітэта дэмабілізаваных воінаў, якія па закліку ЦК ВЛКСМ едуць на Усход—на будоўлі сямігодкі.

Вось і яны. Гэта салдаты і сяржанты запасу, якія датэрмінова дэмабілізаваны ў сувязі са скарачэннем узброеных сіл СССР на 1 мільён 200 тысяч. Воіны сустрэлі дэлегацыю вельмі ветліва і гасцінна.

15 хвілін аказалася дастаткова, каб пазнаёміцца і шчыра пагутарыць. «Самаадчуванне і настрой у камсамольцаў і камуністаў добрыя,— гаворыць нам сакратар партгрупы Яўген Сямёнаў,— усе гараць жаданнем папрацаваць на новабудоўлях сямігодкі».

Ён расказвае, што жадаючых паехаць працаваць на будаўніцтва алюмініевага камбіната было вельмі многа. Райком камсамола накіраваў найбольш вартых. У асноўным гэта камуністы і камсамольцы. Камсорг Вячаслаў Назараў шкадуе, што яму так хутка прышлося развітацца з квітнеючай Беларуссю.

— Але ж гэта не назаўсёды, ты яшчэ прыедзеш да нас у госці,— гавораць студэнты.

— Абавязкова,— адказвае Вячаслаў і многазначна дадае:—і можа не толькі ў госці.

Вучоба — запаветная мара многіх воінаў. Уладзімір Аляксандраў рашыў працаваць і вучыцца і пасля заканчэння дзесяцігодкі паступіць у ВНУ. Такі ж намер і у Сямёнава.

— Вось папрацую,— гаворыць ён,— набяруся вопыту і прыеду да вас ва універсітэт.

— Прыязджай. Мы будзем чакаць вас, сябры,— горача падтрымалі яго студэнты, абменьваючыся адрасамі.

На развітанне Соня Лібкінд пажадала воінам ад імя ўсіх студэнтаў БДУ поспехаў у жыцці і працы на новым месцы жыхарства — пярэднім краі сямігодкі.

**А. СТРЫЖЭВІЧ, студэнт 1-га курса рускага аддзялення.**

# Браць ад універсітэта ўсё

26 і 27 сакавіка дэканат і партбюро філалагічнага факультэта правялі традыцыйную сустрэчу выпускнікоў філфака. Пасля дакладу заслужанага дзеяча навукі БССР, загадчыка кафедры беларускай мовы М. І. Жыркевіча аб навукова-метадычнай падрыхтоўцы славеснікаў слова даецца выпускнікам універсітэта.

Першым выступіў завуч сярэдняй школы Васіль Васільевіч Капусцін. Ён адзначыў, што ва універсітэце студэнты маюць магчымасць навучыцца вадзіць матацыкл, аўтамабіль. І гэтую магчымасць трэба выкарыстоўваць. У школах вучні жадаюць стаць шафёрамі, матацыклістамі, а спецыялістаў, якія б змаглі кіраваць адпаведнымі гурткамі, не хапае.

На трыбуне настаўніца беларускай мовы і літаратуры Алімпіяда Раманаўна Корабава:

— Некалькі год я кірую практыкай студэнтаў. Я пераканалася, што ўласнае жаданне—асноўнае, каб стаць добрым педагогам. Бывае так, што студэнт ва універсітэце займаецца на «выдатна» і «добра». Але на практыцы ў школе ён праяўляе сябе горш, Трэба ўмець прымяняць свае веды на справе, упарта працаваць над сабой, сур'ёзна рыхтавацца да правядзення заняткаў.

Затым слова атрымлівае выпускніца філалагічнага факультэта мінулага года, дырэктар Ашмянскай сярэдняй школы Ніна Фёдараўна Лук'янцава. Яна гаварыла:

— У школу прыходзяць дзеці розных здольнасцей, схільнасцей і характараў, таму настаўнік павінен знайсці падыход да кожнага вучня. Гэтую якасць студэнтам трэба набываць ужо тут, у сценах універсітэта.

Зараз у навучанні важнае месца ўдзяляецца працоўнаму выхаванню школьнікаў. Гэта патрабуе ад настаўнікаў добрага ведання вытворчасці, гаспадаркі.

І яшчэ адно. У вёсцы настаўніку прыдзецца праводзіць сходы калгаснікаў, кіраваць гурткамі па павышэнню палітычных ведаў і самадзейнасцю. Значыць, студэнтам неабходна рыхтавацца ўсебакова да самастойнай работы. Трэба браць з універсітэта ўсё: запас ведаў, вопыт вядомых прафесараў і выкладчыкаў.

Вельмі цікавым было выступленне выпускніцы філалагічнага факультэта 1948 года, настаўніцы сярэдняй школы № 2 г. Мінска Нэлі Абрамаўны Лур'е.

— Стаць добрым педагогам, — сказала яна,—можна толькі пры наяўнасці ўласнага жадання. Галоўнае, канешне,—добра ведаць свой прадмет. Як паднясеш вучню матэрыял, так ён і засвоіць яго. Неабходна выразна выказваць свае думкі.

Хачу спыніцца на масавай рабоце. Уношу яснасць, давядзецца праводзіць не проста мерапрыемствы, а іменна выхаваўчую работу. Трэба пабудаваць сваю гутарку так, каб яна садзейнічала пашырэнню кругагляду вучняў, фармаванню ў іх камуністычных поглядаў.

З вялікай цікавасцю было сустрэта выступленне загадчыка кафедры замежнай літаратуры Д. Я. Фактаровіча.

—У педагогаў,—адзначыў ён,—не так, як у спецыялістаў іншых профіляў. Інжынер, напрыклад, сканструяваў станок, уключыў рубільнік—і бачыць вынікі сваёй працы. Вынікі ж работы настаўніка заўважыш не так хутка. Можна навучыць школьніка чытаць, пісаць, але не выхаваць яго ідэйна. Вось чаму педагог павінен уважліва сачыць, якая аддача атрымліваецца ад яго выкладання. На маю думку, студэнтаў да педагагічнай практыкі трэба дапускаць толькі пасля таго, як яны папрацуюць пры школах піянерважатымі.

Нарэшце, трэба паставіць перад Міністэрствам вышэйшай асветы пытанне аб вызначэнні базавых сярэдніх школ рэспублікі для праходжання вытворчай практыкі нашымі студэнтамі. Толькі ў такіх школах будучыя педагогі змогуць пераняць вопыт выкладання.

Лейтматывам усіх выступленняў была думка, што настаўнік у нас пастаўлены на такую вышыню, на якой ён не стаяў і не стаіць ні ў адной капіталістычнай краіне.

**В. КАВАЛЬКОЎ,**
**студэнт 3 курса філфака.**

## *Працягваецца агляд мастацкай самадзейнасці*

4 красавіка ў актавай зале концэртам географаў пачаўся агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. На універсітэцкай сцэне выступалі таксама спевакі, танцоры, дэкламатары матэматычнага, юрыдычнага і біялагічнага факультэтаў. Паспяхова ў параўнанні з мінулым годам выступілі географы, біёлагі, матэматыкі. Журы агляду адзначыла, што юрыдычны факультэт, які заняў на мінулым аглядзе першае месца, зараз выступіў значна ніжэй сваіх магчымасцей. Частка нумарой праграмы паўтарала мінулагоднія. Выступленне самадзейных артыстаў юрфака паказвае, што культурна-масавая работа на факультэце ў заняпадзе.

Выдатна выступілі на аглядзе танцавальныя калектывы геафака, біяфака, матфака. Добра выконвалі песні Рабышэўская і Працкевіч (геафак), Драбышэўская і Паўлюкевіч (біяфак), Барташэвіч, Хаджаева, Краўцова (матфак), Сахараў (юрфак). З поспехам выступілі дэкламатары Аляксеева (геафак), Душкевіч (біяфак), Кульша (матфак), Астроўскі (юрфак).

Лепшыя нумары будуць выканаsuccessfully на заключным канцэрце.

**В. БАРКУН,**
**старшыня культурна-масавай камісіі прафкома.**

## Факультэцкі лекторый

На фізічным факультэце створаны лекторый. Планам лекторыя прадугледжана чытанне шэрагу лекцый для студэнтаў фізфака аб навейшых дасягненнях навукі. Нядаўна доктар фізіка-матэматычных навук І. З. Фішэр прачытаў лекцыю з гэтага цыклу па адной з важнейшых праблем сучаснай фізікі—«Элементарныя часціцы».

На лекцыі прысутнічала многа студэнтаў з іншых факультэтаў.

**Л. КУЗНЯЦОВА.**

## *Два тыдні ў краіне сяброў*

**ФОТАРЭПАРТАЖ**

**...Успамінаюцца словы вядомага чэшскага пісьменніка Яна Дрды, яго аўтограф Ленінградскаму калегу: «Ты не забывай, ёсць чэхі, народ...».**







Гэтыя словы кранаюць сэрца. Западаюць глыбока ў душу. Пасля вяртання на Радзіму мне хацелася гаварыць аб гэтым кожнаму стрэчнаму:

«Ты не забывай, ёсць чэхі, народ, які пойдзе з вамі на жыццё і на смерць...».

У лютым гэтага года група беларускіх турыстаў наведала Чэхаславакію. 14 дзён — гэта вельмі мала, каб як след пазнаёміцца са шматвяковай гісторыяй і культурай чэшскага народа. Не ўсе даты, падзеі, помнікі далёкага мінулага знайшлі сваё адлюстраванне ў нашых блакнотах і аб'ектывах фотаапаратаў. Затое ў памяці назаўсёды застануцца гарачыя сустрэчы з людзьмі, Чэхаславакіі. Іх адкрытыя і мілыя твары, усмешкі, сяброўскія поціскі рук і слёзы пры раставанні.

**В. ДАШУК,**
**студэнт V курса аддзялення журналістыкі.**

На здымках:

1). Пражскі крэмль Градчаны

2) Задушэўная размова. Горад Фрыдэк. Адзінаццацігадовая школа імя Юліуса Фучыка.

3) Маўзалей Клемента Готвальда. Прага.

4) Канцэрт у гонар гасцей. Школа імя Ю. Фучыка. Дзіцячы хор спявае для гасцей чэшскія песні.




*Пісьмы ў рэдакцыю*

## Пакой адпачынку, у якім... нельга адпачываць!

*На партыйным сходзе універсітэта, які адбыўся ў пачатку сакавіка, было вырашана прывесці ва ўзорны выгляд пакоі адпачынку інтэрнатаў. Праз некаторы час гэта рашэнне было паўторна запісана ў рэзалюцыю чарговага партсходу.*

*Калі прымалася першае рашэнне, была яшчэ зіма. Цяпер вясна. А ў пакоі адпачынку інтэрната па вул. Свярдлова па-ранейшаму сумна стаяць абшарпаныя сталы, на вокнах ніводнай фіранкі. Не знойдзеш тут ні часопісаў, ні газет, ні шахматаў. Раней пакой хоць крыху ўпрыгожваў тэлевізар, аднак нядоўга. У час прагляду перадач ён сапсаваўся. З таго моманту мы яго больш не бачылі.*

*Адміністрацыйна - гаспадарчая частка універсітэта і студсавет інтэрната, відавочна, не разумеюць таго факта, што пакой павінен быць месцам вучобы і месцам адпачынку студэнтаў. Даўно час выканаць рашэнне партсходу.*

**А. КУКЕВІЧ,**
**студэнт I курса філфака**

## Секцыя павінна працаваць

*Яшчэ 15 лютага гэтага года на камсамольскім сходзе гістарычнага факультэта быў заслуханы даклад адказнага за абаронную работу на факультэце т. Буцько. У дакладзе адзначалася, што ва універсітэце ствараецца мотасекцыя. Сродкі на матацыклы адпушчаны, застаецца іх толькі набыць. Між іншым т. Буцько сказаў, што няма жадаючых займацца ў мотасекцыі. Але ж гэта не так. Жадаючых атрымаць пасведчанні матацыклістаў больш чым дастаткова. Аматары даведаліся, што матацыклы хутка будуць атрыманы, і, на наш погляд, можна ўжо зараз ствараць секцыю. Многім з нас хочацца ў гэтым сезоне паспрабаваць свае сілы і на спаборніцтвах.*

*Цікава, чаму ж адпаведныя органы затрымліваюць арганізацыю секцыі?*

**ГРУПА СТУДЭНТАЎ ГІСТФАКА.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31; тэл. 2-07-19. Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.

АТ 06873. Зак. 718. Друкарня выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Тыраж 2000 экз.